Бярозка

№ 8/2013(1023)

bjarozka@mail.ru
vk.com/club 34570145











«Зубронак»!!!

Хто ж не чуў пра легендарны дзіцячы летнік «Зубронак»?! Пуцёўкі на летнюю змену раскупляюцца за першы тыдзень студзеня! А некалькі соцень жадаючых абавязкова не паспеюць і застануцца ні з чым... Вось што такое «Зубронак»! А таксама казачная Нарач — самае вялікае возера Беларусі. І сасновы бор з пяшчотным аздараўляльным паветрам! Цэлых 76 гектараў — тэрыторыя гэтай напраўду шчаслівай краіны. «Бярозка» проста не магла не наведаць легендарны дзіцячы летнік, заснаваны ажно ў 1969 годзе.

Збудуем вежу з нарачанскіх шышак!

Свой дзень у «Зубронку» я правяла з Таццянай Чыжык — намеснікам дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце. Таццяна Аркадзьеўна жыве за 11 кіламетраў ад «Зубронка», а дырэктар Надзея Ануфрыева — увогуле на тэрыторыі летніка. Дарослыя прадстаўнікі гэтай дзіцячай краіны аддаюцца сваёй працы цалкам.

Паўдня мы шпацыравалі па «Зубронку» — і, ну, вядома, усё пабачыць не паспелі. Упэўнена, што вас таксама, як і мяне, зачаравалі б мілыя дрэўцы з гірлянд, замест звычайных ліхтароў. Яно і цікава, і энергію эканоміць. Дарэчы, дзеці-«зубраняты», як правіла, такія разумненькія і дасціпныя, што самі змарнаваную электраэнергію з інтарэсам вылічваюць.

У летніку, кожным яго куточку, вельмі чыста, вельмі ахайна. На тэрыторыі цэнтра ёсць... Велізарны спіс усяго! Бо «Зубронак» — гэта 41 — так, 41!!! — будынак у водарным сасновым лесе. Крама, карчма, кафэ, хутар, стадыён... Заапарк — з дзіцячымі агародамі. У «Зубронку» ёсць дзве выдатныя спартыўныя залы з новенькім каштоўным пакрыццём як на Алімпійскіх гульнях. Басейн, саўна, кінаканцэртная зала, актавая зала, відэасалон, більярдная, камп'ютарны клуб, баскетбольная і гандбольная пляцоўкі, тэнісны корт, а таксама пляцоўка для пляжнага валейбола.

Мінаем батут, на якім тры радасныя падлеткі.

— Але скакаць на ім — доўга не паскачаш. Бо ў нас тут цэлы дзень распісаны. Зранку, зразумела, зарадкай, а потым разнастайнымі гурткамі, хобі-цэнтрамі, клубамі, усемагчымымі мерапрыемствамі.

Карацей, «Зубронак» не для тых, хто прагне вольніцы. Тут — дысцыпліна. Але ж і цікава, столькі нечаканых заняткаў!

Напрыклад, у дзень майго гасцявання ладзіўся конкурс на будаванне вежы з шышак. У кожнага атрада яна атрымалася па-свойму непаўторнай! Пры жаданні тут можна навучыцца рабіць рамку з макаронаў альбо кошык з папяровых трубачак, бранзалет ці футарал са скуры, скрынку з паперы ў тэхніцы «квілінг» для захоўвання каштоўных рэчаў. А яшчэ ёсць мерапрыемства, што называец-



ца «Роўны вучыць роўнага»: дзелішся якім-небудзь сваім умельствам з раўналеткамі (іграць на гітары, вывучаць замежную мову, заплятаць прыгожыя косы, займацца графікай, вырабляць сувеніры і многае іншае).

Шаснаццацігадовая Воля Скалянкова з Мінска распавядае: «Я пяты раз прыехала сюды. Падабаецца! За ўсе гады ні разу не было такога атрада, каб мы не сябравалі. Кожны раз раз'язджаемся са слязьмі! І мерапрыемствы тут вельмі падабаюцца. "Міс і містэр Зубронак", скажам. А зараз у нас адбываецца фестываль культур. Кожны атрад разыгрывае нейкую краіну і прадстаўляе потым яе. Краіна нашага атрада — Куба».

А вось у адзінаццацігадовага Даніка Вішнеўскага з Магілёва такія ўражанні: «Я прыехаў сюды другі раз. Весела! Добрыя сябры! Добрыя забавы! Асабліва запомнілася Купалле, з вялікім вогнішчам. Яго і дзеці, і дарослыя падрыхтавалі. Папараць-кветку шукалі, але наш атрад не знайшоў. З сябрамі, якіх я спаткаў у "Зубронку", сустракаемся, калі яны з Магілёва. А калі з іншага горада, дык перапісваемся».

Размаўляючы з дзецьмі, адзначыла: сябры — самы вялікі скарб, які знаходзіш у "Зубронку". Некаторыя дамаўляюцца сустрэцца ў адной і той жа змене. А сувязь на працягу восені-зімы-вясны абавязкова падтрымліваецца.

Найлепшы ва ўсёй Беларусі?..

Таццяна Аркадзьеўна паказвае мне школу, звонку ўпрыгожаную рэпрадукцыямі беларускіх мастакоў. Прыехаць жа ў «Зубронак» можна нават сярод года, наведваючы і тут урокі. Школа ў гэтай шчаслівай нарачанскай краіне працягвае функцыянаваць нават на вакацыях, ператвараючыся, аднак, у штосьці небанальнае. «Таямнічы пакой» — чытаю на адных дзвярах. «Чароўная школа Хогвардса» — чытаю на наступных дзвярах. Завітваем у гэты пакойчык: дзевяцігадовыя хлопчыкі і дзяўчынкі, з непадробным інтарэсам, назіраюць за эксперыментамі па фізіцы і хіміі.

А Нарач? Распавядаючы пра «Зубронак», нельга забыцца на Нарач: яна тут Самая Галоўная. Часам нават і гурткі адмяняюць, каб больш часу «зубраняты» на пляжы бавілі. Кацер, катамараны, гідрацыкл, «банан», лодкі...

— Было б несправядліва, каб самае вялікае возера Беларусі мы не скарыстоўвалі напоўніцу, — надзвычай слушна заўважыла Таццяна Аркадзьеўна.

У «Зубронку» я пазнаёмілася і з дарослымі. Яны, як і дзеці, таксама ўлюбёныя ў гэтую чароўную нарачанскую краіну. Ігар Чэб — цікавы важаты. Увесь у феньках… Гэта яго 21-е лета ў «Зубронку»! Ёсць тут і тыя, хто ні адзін год правёў у цэнтры маленькім «зубранём», падпарадкоўваючыся ўсім яго законам і традыцыям, а цяпер, паступіўшы ў педагагічную ўстанову, з задавальненнем выхоўвае новае пакаленне «зубранят».

— Ад важатага вельмі залежыць камфорт дзіцяці, — каментуе Таццяна Аркадзьеўна. — На 21 дзень ён становіцца і матуляй, і татам, і сябрам, і дарадцам, і арганізатарам усяго самага цікавага, што адбываецца ў атрадзе.

Таццяна Венска, кіраўнік харэаграфічнага ансамбля «Карусель», бесклапотна загарала на пляжы. Разам з групай дзяцей яна трапіла ў «Зубронак» за перамогу ў конкурсе.

— Добра тут! Пазнаёміліся з харэаграфічным ансамблем з Масквы «Школьныя гады». Увогуле, мы толькі што вярнуліся з фестывалю з Балгарыі. Але тут, напэўна, яшчэ больш, чым у Балгарыі, падабаецца.

«Зубронак» — элітны летнік! Кажуць, што арганізацыя мерапрыемстваў і чысціня тут проста непараўнальныя! Не пабаюся казачную нарачанскую краіну акрэсліць так: «самы лепшы ў Беларусі летнік!». Паразмаўляйце з дзецьмі: большасць з іх прыязджае сюды ўжо не першы, а пяты, сёмы раз.

У якасці падарунка сюды накіроўваюць асабліва паспяховых. Але ж за поўны кошт пуцёўку можа атрымаць кожны. Тут шмат падлеткаў з Масквы, Санкт-Пецярбурга. Ёсць дзеці з Казахстана, Латвіі, Украіны. А вось дзевяцігадовы Філіп нарадзіўся ў беларускіх эмігрантаў у Амерыцы. А ўлетку — Беларусь і «Зубронак».

З захапленнем у Доме дзіцячай творчасці я разглядала самаробныя падарункі падлеткаў летніка. Дзіцячая рука, але як прафесійна, як моцна зроблена! Калі ў «Зубронку» такія падарункі пакідаюць, дык значыць гэта зусім не перабольшанне, што адсюль са слязьмі ў вачах ад'язджаюць.

Па ўзнёслым сасновым лесе з Таццянай Аркадзьеўнай блукалі да позняга надвячорка. Уражанні, уражанні!.. Колькі ж іх сёння было! Яшчэ крыху — і я лопну, сённяшнімі ўражаннямі перапоўненая. «Зубронак» — гэта штосьці АГРОМНІСТАЕ!» — такая мая галоўная выснова напрыканцы дня.

Міжнародны

Штогод у «Зубронку» ладзяцца фестывалі і конкурсы. Напрыклад, конкурс-фестываль дзіцячых сродкаў масавай інфармацыі «Свежы вецер». Конкурс «Юныя таленты Беларусі»: галіна «фальклорныя калектывы», паэзія, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, харэаграфія, вакал, харавое мастацтва, тэатральнае мастацтва.

Летнік сапраўды міжнародны. Напрыклад, тут ёсць кадэцкая змена Саюзнай дзяржавы: 240 рускіх кадэтаў плюс 240 беларускіх. Вяртаючыся ў Мінск у машыне дырэктара Надзеі Генадзьеўны, якая здзяйсняла камандзіроўку ў сталіцу, пачула па радыё навіну: сёлета «Зубронак» прымае 25 японскіх падлеткаў.

Такая вось шчаслівая краіна — і масквічамі, і іншымі замежнікамі ўпадабаная — ёсць на нашай Нарачы…

Гаючым сасновым паветрам дыхала Кацярына БЕЗМАЦЕРНЫХ

У цябе ўсё атрымаецца!



Сёння табе не надта пашанцавала? Ранішняя кава пралілася на новыя джынсы, у аўтобусе аддавілі нагу, а потым лепшы сябар пайшоў гуляць без цябе? Або нешта іншае, яшчэ больш жахлівае і крыўднае? Напрыклад, ты не ведаеш, як да заўтра зрабіць рэферат на пятнаццаць старонак, як паступіць ва ўніверсітэт? Адчай падступае з усіх бакоў, і рукі апускаюцца долу...

Тут і з'яўляюцца такія жорсткія думкі: «Ды я ж наогул нешчаслівы! Нічога не атрымаецца, я нікому не патрэбны, што ж за жыццё такое? Вось у іншых!..» Было такое?

Непрыемнасці не лепшым чынам уплываюць на наш настрой. І вось напрыканцы такога цяжкага дня з'яўляецца жаданне зашыцца ў куточак і пацешыць сваю душу слязьмі. Здаецца, што потым стане лягчэй: з'явіцца ўпэўненнасць, жаданне працаваць, разуменне іншых. «Кідай дурное, браце вожык! — любіць казаць мая матуля, пры гэтым выцягваючы мяне, жыццём пакрыўджаную, з аблюбаванага закутка. — Гэта не справа!» — упэўнена паведамляе яна.

Чаго ты дасягнеш, аплакваючы свой гаротны лёс? Шкадавання! Але ці патрэбна яно моцным людзям? Ці патрэбна яно табе, маладой і перспектыўнай асобе? Не!

Дзейнічай! Пачынай з меншага, рабі хоць што-небудзь. Зруш сябе з мёртвай кропкі. Любіш памарыць? Таксама цудоўна, бо нашыя думкі матэрыяльныя. І гэта не пустыя словы. Калі ты сапраўды нечага хочаш, гэта будзе ў тваім жыцці. Няхай недасягальная на першы погляд вяршыня матывуе цябе. Цягніся да яе, імкніся ў думках і дзеяннях, і неба будзе на тваім баку. Бо што такое мара? Гэта мэта, сэнс жыцця. Пройдзе час, нешта зменіцца, нешта падзабудзецца, але галоўнае застанецца: звычка імкнуцца вышэй, далей.

Ты можаш болей, чым здаецца. Унутры — неабсяжны акіян і бяскрайняе неба. Так. Там цэлая нязведаная галактыка. Там моц. Не бойся марыць! Тады зоркі над тваім дахам пачуюць голас зорак, што ў тваёй душы. І працуй. Шукай сябе, прасі парады і дапамогі ў мудрэйшых. Глядзі наперад, глядзі вышэй. У цябе атрымаецца. Калі нечага моцна жадаеш і спрабуеш гэта атрымаць, то ідзеш, набліжаешся да мэты. А ў дарозе — не сумнявайся ў сабе, не збочвай!

І будзе гонар за самога сябе. Адчуванне палёту: атрымалася! Хіба адчуванне ўласнай перамогі не вартае таго, каб распачаць шлях?

Анастасія ХУРСЕВІЧ,
Інстытут журналістыкі БДУ,
фота Кацярыны БЕЗМАЦЕРНЫХ

Шпацыр з філасофскім настроем





Сёлета Маладзечна, мой родны, мой любімы горад, адзначае 625-годдзе.

Вельмі люблю прайсціся па дарагіх сэрцу мясцінках маёй малой Радзімы: і цёплымі святочнымі днямі, і халоднымі зімовымі вечарамі, калі людзі так нагадваюць гаротных змерзлых вераб'ёў і хутчэй спяшаюцца ў цёплыя ўтульныя кватэры.

Звычайна моладзь нашага горада тусіць ля Цэнтральнай плошчы ды на мясцовым Брадвеі — вуліцы Прытыцкага. Тут размясціліся некалькі кафэ, піцэрыя, кінатэатр «Радзіма». Я ж, наадварот, упадабала тыя куточкі нашага горада, што захавалі сваю натуральную прыгажосць і свежасць, далей ад цэнтральных вуліц і праспектаў.

Адным з такіх прыемных месцаў я лічу невялікі пагорак, які можна ўбачыць, калі ісці ўздоўж вуліцы Машэрава амаль да самай чыгункі. Пагорак гэты мне чамусьці нагадвае лянівае медзведзяня. Раней, калі вучылася ў мастацкай школе, сюды хадзіла маляваць. Вось тады і адзначыла для себя гэты куточак.



Яшчэ адным маім любімым месцам з'яўляецца маленечкі парк побач з тэатрам лялек «Батлейка». Кроны дрэў там настолькі густыя, што могуць схаваць ад дажджу, а ў гарачыя летнія дзянькі — ад невыноснай спякоты. Гэта яшчэ і памятнае месца. Таполі ахоўваюць спакой герояў Вялікай Айчыннай вайны, пахаванных у брацкай магіле.

Калі ісці ўніз па вуліцы Драздовіча, дык можна выйсці на Лібава-Роменскую, а па ёй рухацца далей на гук цягнікоў. Люблю нетаропка крочыць па няроўнай дарозе пад грукат колаў і разважаць. Прагулка адразу набывае філасофскі настрой. Напэўна, таму мяне і захапляе гэтая вуліца.

Наступны прыпынак — мост, які накрывае сваёй выгінастай спінай адразу некалькі вуліц. Нібы каменны рэгуліроўшчык, накіроўвае ён плыні машын па розных напрамках. Часам даволі цікава назіраць за ўсім гэтым рухам, абапёршыся на жалезныя парэнчы моста. А яшчэ тут можна любавацца яркімі фарбамі захаду.

Але ж вось... Сутонее... Хутка ў гарадскіх парках запаляць ліхтары, святло якіх будзе плямамі адлюстроўвацца ў вадаёмах. У парках заўсёды шмат людзей, але і зацішны куток можна знайсці. Зімой прыйдзеш — сядзеш на абледзянелую лавачку і глядзіш, як маці з сынам кормяць згаладалых птушак. А летам уладкуешся на гэтую ж самую лаўку, пакладзеш кнігу на калені і атрымліваеш асалоду ўжо толькі ад таго, што вакол цябе моўчкі стаяць дрэвы, пакрытыя свежым зялёным лісцем, а паветра прапітанае атмасферай летняга спакою і радасці. А потым, у філасофскім настроі, разважаючы, не заўважыш, як да свайго пад'езда дайшоў. Азірнешся: пачынаецца дожджык, вакол ліхтары-агні гараць, людзі спяшаюцца дадому.

Роднае, роднае Маладзечна!

Аліна ЛІТВІНЕНКА, 16 гадоў,
школа журналістыкі «Маладзік», г. Маладзечна
фота Наталлі Скарынка

Мой улюбёны Дзядзя Сцёпа



З дзяцінства мне казалі, што я маю вялікі рост. Наколькі ўсе памыляліся я зразумела, калі аднойчы ў чаканні зялёнага сігналу святлафора пабычыла ля сябе Дзядзю Сцёпу XIX стагоддзя. Вышэйшы за мяне амаль што на тры галавы! З вялікімі ад здзіўлення вачыма я ішла па вуліцы, назіраючы, як ён, не спяшаючыся, крочыць. Пазней у той самы дзень я даведалася пра станоўчыя вынікі абавязковай кантрольнай. Радасці не было канца. Дзень прайшоў на пазітыве.

...Букет рамонкаў. Проста так! Ад незнаёмца Дзядзі Сцёпы. Прыемна. Настрой быў паганы, але ўмомант узняўся!

...Раніца. Пешаходны пераход. Чаканне. Ад неспадзявання я ледзь утрымалася на нагах. Двухметровы юнак зноў побач. Нават усміхнуўся, калі я са здзіўленнем на яго паглядзела. У той дзень на занятках я толькі тым і займалася, што думала пра Дзядзю Сцёпу.

...Выходны дзень. Спяшаюся ў бібліятэку. Думкі паглынулі цалкам, нікога не заўважаю побач. Перад маім тварам дзверы адчыняюцца, я нават не паспела працягнуць руку сама. Праз некалькі хвілін да мяне даходзіць тое, што адбылося: дзверы мне па-джэнтльменцку адчыніў ужо знаёмы незнаёмец... Дзядзя Сцёпа!

...Панядзелак. Пешаходны пераход. Не ведаю чаму, але юнака я сёння не ўбачыла, хаця і чакала. Пасля заняткаў даведалася, што мая бабуля захварэла. Сэрца — у пятках. Настрой зусім сапсаваўся. Вечарам было цяжка заснуць, як ні старалася.

...Раніца аўторка. Без усмешкі. Няма і майго незнаёмца. Перажываю, як ні дзіўна. Ды раптам... Водар кветак! І зноў, проста як з-пад зямлі, вырас юнак. Мне стала спакайней на душы. Працягвае букет:

— Усміхніся! Гэта табе да твару!

Ніколі раней мне не прыходзілася сустракаць хлопцаў, якія мовяць пабеларуску. І гэта здзівіла не менш, чым букет рамонкаў — проста так, ад знаёмага незнаёмца, прыемна.

...Гэты хлопец мне прыносіць поспех. Калі пераходзім вуліцу разам, дык дзень будзе выдатным, калі не — штосьці пойдзе не так. Ён стаў часткай майго жыцця. Штодзень, чакаючы зялёнага святла на пераходзе, я ў думках варажу на рамонках: «Прыйдзе-не прыйдзе? Прыйдзе-прыйдзе?..»

Кацярына ЛЯСУН

Яго трагедыя



— А ці ведаеш, Волечка, якая мая ўлюблёная кніга?

— Дакладна не, але здагадваюся... Нешта з амерыканскай прозы.

— Так, — Дзяніс пацалаваў руку каханай.

— І якая ж?

— «Амерыканская трагедыя» Тэадора Драйзера.

— Цікава!

Волечка, дзяўчына з блакітнымі вачыма, прывабіла хлопца гадоў 5 таму. І з таго часу яны разам. Шчырасць у адносінах, цеплыня сустрэч — усё даволі сур'ёзна. Яна — мастак, ён — індывідуальны прадпрымальнік. Вольга стварае ўтульнасць, Дзяніс — фінансава забяспечвае. Усё як і трэба. Сябры здзіўляюцца, чаму да гэтага часу яны яшчэ не пашлюбіліся. Але ж павінна быць якая-небудзь прычына для шлюбу! А можа, у іх каханні шлюб увогуле не галоўнае. Ці адзін з іх яшчэ не гатовы да такага сур'ёзнага кроку. Альбо той самы час не прыйшоў.

Сустрэча ў рэстаране: свечкі, сервіроўка, келіх віна і шклянка мінералкі. Нейкія салаты. Дзяніс сёння, менавіта сёння, вырашыў распавесці ўсё. Ды і Волечцы таксама трэба нешта сказаць.

— Хачу сказаць нешта істотнае... — пасля доўгага маўчання вымавіў Дзяніс.

— І я таксама! — вымавіла Волечка. — Давай ты першы!

— Я... здрадзіў табе!..

Злосць і крыўда пачалі раздзіраць дзяўчыну на кавалачкі. Мужчыны — такія: калі ідэальна і без прыгод, тады ім сумна. Новыя ўражанні патрэбныя!..

Яна не змагла выслухаць да канца. Падарваўшыся з крэсла, Вольга выбегла з рэстарана. Не заўважаючы нічога вакол, ляцела. Падалей ад яго, здрадніка!

На яго вачах яе збіў аўтамабіль...

Спалоханы кіроўца. Людзі. Калі прыехала «Хуткая», было ўжо позна. Удар быў моцны. Насмерць.

Пасля Дзяніс даведаўся, што хацела Волечка яму паведаміць... Разам з ёй загінула і дзіця, якому не лёс быў нарадзіцца... У такія моманты разумееш, што ніякія грошы не вернуць назад час. І навошта ён ёй гэта паведаміў? Ніхто не заменіць каханага чалавека!

Кватэра. Дзверы. Ключы. Тэлефон аб сцяну. Вільготныя вочы.

...Без Волечкі...

Кацярына ЛЯСУН

Шчаслівая пятніца


Раніца гэтай пятніцы была халоднай і дажджлівай. У перадсвітальных прыцемках, каля шасці раніцы, маладая жанчына спяшалася на працу.

Яе звалі Таня. Зусім хутка ёй споўніцца трыццаць пяць гадоў. З дзяцінства яна прывыкла выконваць усё ў прызначаны час, была таленавітай і дысцыплінаванай. Школу скончыла з залатым медалём, ва ўніверсітэце, адным з вядучых у краіне, на эканамічным факультэце была лепшай у сваім выпуску. Уладкавалася на працу ў адзін са сталічных банкаў на пасаду старэйшага бухгалтара і працуе там дагэтуль. Жыве адна. Таня не знайшла чалавека, з якім ёй хацелася б праводзіць увесь вольны час і, вяртаючыся дадому штовечар, бачыць яго твар. Аднапакаёвую кватэру непадалёк ад цэнтра прыдбала за свае грошы, без дапамогі родных. Але ж Таня — самотная! І аблягчае яе адзіноту хіба што Шакаладнік — тоўсты і дагледжаны персідскі кацяра. Вечарамі чытае ўлюбёныя раманы, а па выходных выбіраецца ў госці да сябровак, купляючы прысмакі іх дзецям.

Гэтая пятніца для яе была асаблівай. Сёння яна нарэшце здасць квартальную справаздачу за гэты месяц, магчыма, атрымае прэмію, а ўвечары яе чакае сустрэча з былым аднакурснікам, які, як высветлілася, учора прыляцеў з Галандыі і чамусьці ўзгадаў менавіта яе. Патэлефанаваў і прапанаваў сустрэцца. Таму настрой у Тацццяны быў выдатным. Бадзёра перакрочваючы лужыны, яна рухалася да аўтобуснага прыпынку. Машыну яна купляць баялася, бо пастаянныя зводкі навін пра страшныя ДТЗ для яе былі падказкай: ніякіх аўтамабіляў.

Пад'ехаў аўтобус, які ішоў да самай працы. Таня ціха ўсміхнулася: гэты дзень проста абавязаны быць удалым. Не гледзячы на тое, што людзей на прыпынку была шмат і практычна ўсе паспрабавалі залезці ў аўтобус, Таццяне пашанцавала прабрацца ў салон адной з першых і заняць адзіночнае месца насупраць выхаду, каля акенца. Паставіўшы мокры парасон-кіёк каля сядзення, яна пачала глядзець у акно на аўтамабілі, якія праязджалі міма. Праз некалькі прыпынкаў у салоне аўтобуса стала прасторней, але ўсе месцы па-ранейшаму заставаліся занятымі. Дождж мацнеў, буйныя кроплі з грукатам білі па шкле. Таня драмала.

На прыпынку «Уманская» стаялі досыць доўга, і халодны вецер, падзьмуўшы з дзвярэй, прымусіў Таню канчаткова прачнуцца і зірнуць у бок выхаду. У аўтобус спрабаваў залезці мужчына гадоў сарака пяці—пяцідзесяці. Ён абапіраўся на мыліцы, ростам быў не больш за паўтара метра, сівыя валасы былі ўскудлачаныя, а апрануты ён быў у старую і не надта ахайную куртку. Узлезшы на першую прыступку, ён пахіснуўся і не утрымаў раўнавагу, пачаў падаць уніз. Але хтосьці з маладых людзей, якія стаялі на вуліцы, падхапіў



яго і дапамог забрацца ў транспарт. Дзверы нарэшце зачыніліся, аўтобус рушыў з месца.

Таня імгненна падхапіла свае рэчы і ўстала:

— Сядайце, калі ласка, — усміхнулася яна, звяртаючыся да мужчыны.

Той з пагардай у голасе адказаў:

— Ды сядзі ты, я ў сваім жыцці насядзеўся ўжо, — у яго голасе адчувалася злосць.

— Ды не, нічога! Сядайце, мне зусім хутка выходзіць, — схітрыла Таня.

— Не буду я садзіцца! Дзе твая павага? Я не мужчына ці як? Што табе не зразумела? — прагыркаў незнаёмец. — І хто вас такіх выхоўвае! Цуд! З глузду з’ехалі ўсе, адныя дурніцы навокал!

Тані раптам стала вельмі няёмка. Людзі навокал проста моўчкі назіралі гэтую сцэну, і яна адчувала на сабе іх зацікаўленыя погляды, пры гэтым у салоне павісла мёртвая цішыня.

Таццяна працягвала стаяць. Выходзіць ёй было яшчэ не хутка, у транспарце па-ранейшаму людна. Яна стаяла побач з крыўдзіцелем. Ніхто вольнага месца не займаў. Але на адным з прыпынкаў зайшоў малады хлопец гадоў дваццаці пяці. Убачыўшы вольнае месца, ён, не задумваючыся, усеўся. Малады чалавек пачаў даставаць з кішэні плэер з навушнікамі, але раптам за плячо яго схапіў ганарысты мужык:

— Ты, шчанюк паскудны, не табе месца саступалі, вунь тая жанчына ўстала і стаіць цяпер, — трасучы за плячо маладога чалавека, лютаваў мужчына.

— Сядайце, сядайце! — ціха сказаў хлопец, хутка саскочыўшы з месца і адышоўшы ад яго падалей.

— Ды не патрэбна мне ваша месца, дурні! — зароў мужык.

Праз хвіліну аўтобус пад’ехаў да банка, у якім працавала Таня. Яна як мага хутчэй выскачыла з аўтобуса і, не раскрываючы парасон, накіравалася на працу.

Здавалася, што яе аблілі чымсьці агідным і брыдкім. Жанчына заўсёды лічыла сябе чалавекам культурным і ветлівым. І не думала ніколі, што хтосьці мог бы так адрэагаваць на яе простую ветлівасць. Яна ішла і думала, ці правільна зрабіла, што саступіла месца, а потым стаяла...

Дзіўна, але праз гэтую быццам бы драбязу настрой Тані быў сапсаваны на ўвесь дзень. Працаваць не хацелася. Здаўшы справаздачу, яна стала чакаць завяршэння дня. Калі ёй патэлефанаваў былы аднакурснік, яна, спаслаўшыся на неадкладныя справы, адмовілася ад сустрэчы. А шостай вечара выйшла з банка і накіравалася да прыпынку. Але дадому паехала не на аўтобусе — на маршрутцы. І калі апынулася ў сваёй кватэры, узяла на рукі Шакаладніка, накрылася пледам і, цяжка ўздыхнуўшы, заснула. З неадступным пытаннем: ці магчыма жыць адначасова правільна і шчаслівa?

Паліна БУЧЭЛЬ

Акіян



Мы прызвычаіліся да таго, што рок — гэта нешта англамоўнае, з Захаду, нешта не зусім зразумелае і не зусім роднае для нашых вушэй. Але існуе яшчэ і славянскі рок. Безумоўна, ён вельмі адрозніваецца ад класічных Led Zeppelin ці Deep Purple. І, тым не менш, ён мае поўнае права займаць сваё пачэснае месца на арэне сапраўднай сур'ёзнай музыкі.

Канчаткова я пераканалася ў гэтым, калі сябар з Кіева паказаў мне відэакліп на новы спеў «Обійми» ўкраінскага гурта «Океан Ельзи». Першае, што я адчула, гэта пераварот недзе ўсярэдзіне. Пачуцці былі незвычайныя. Настойліва раю ўсім пагглядзець гэты кліп. Нягледзячы на тое, што спеў гучаў на ўкраінскай мове, мне ўсё было зразумела да апошняга слова: іх мова падобная да нашай. Пасля прагляду я яшчэ доўга асэнсоўвала пачутае і ўбачанае... А ўбачыла-пачула я нішто іншае, як часцінку сапраўднага ўкраінскага высокага мастацтва!

Потым я пачала слухаць гэты гурт усё больш і больш... І тады зразумела, што палю-



біла яго. Кранальная музыка, змястоўныя тэксты, надзвычай запамінальны вакал саліста Вячаслава Вакарчука прымусілі мяне змяніць погляд на жыццё. Я не перабольшваю! Як быццам бы доўгі час ты насіў цёмныя акуляры, каб не даць сонцу асляпіць цябе. Але ж я зняла акуляры пад уздзеяннем гэтай таленавітай музыкі — і не аслепла, а наадварот, стала бачыць лепш!

Гурт «Океан Ельзи» вылучаецца сярод іншых сучасных выканаўцаў. Ён мае сваю яскравую індывідуальнасць! Менавіта таму гурт і пакінуў велізарны адбітак як на маёй творчасці, так і на маім жыцці. Пачаўшы цікавіцца ім, адчула, што маю цягу да ўкраінскай мовы гэтак жа, як і да роднай беларускай. Гэта і падштурхнула мяне заняцца яе вывучэннем, паспрабаваць напісаць на ёй свой першы «аповід».

Шматлікія гурты сёння ўжо не ствараюць такіх хітоў, як рабілі гэта некалькі гадоў таму. Але «ОЕ» як ствараў калісьці хіты, так і працягвае ствараць. Дарэчы, не так даўно ў Лондане вялася дапрацоўка іх новага альбома пад назвай «Земля». Асобна ўжо былі выпушчаны два сінглы («Обійми» і «Стріляй»), таксама адбыліся прэм'еры іх відэакліпаў. Зараз новыя (і старыя таксама!) спевы «Океана Ельзи» з'яўляюцца сапраўднымі хітамі на музычных тэлеканалах. Сам жа альбом «Земля» выйшаў у продаж 15 мая. Варта адзначыць і тое, што новы альбом стаў сапраўдным падарункам на дзень нараджэння вакаліста Вячаслава Вакарчука, які 14 мая адзначыў сваё 38-годдзе. На днях у сеціве я заўважыла фотаздымкі вуліц Нью-Ёрка, па якіх былі развешаныя ўлёткі з выявай Вакарчука, яго датай «народження» і подпісамі: «І нехай знає весь світ!» і «Твій голос знайде мене завжди». Такое віншаванне падаравалі свайму куміру ўкраінскія жыхары мегаполіса.

У падтрымку свайго новага альбома гурт праводзіць турнэ спачатку па Украіне, а потым — па странах СНД і гарадах Паўночнай Амерыкі.

Для мяне «Океан Ельзи» і талент Вячаслава Вакарчука сталі сапраўдным адкрыццём! Зараз цяжка ўявіць сябе, сваю душу і жыццё без іх лірычных спеваў. Мая самая запаветная мара — патрапіць на іх жывое выступленне. Не ведаю, што зможа зрабіць мяне больш шчаслівай...

Наталля ЛЕНСКАЯ, 16 гадоў,
школа журналістыкі «Маладзік», г. Маладзечна

Прыгоды над Волгай

Выправіцца аўтастопам на музычны фестываль — выдатнае ўпрыгожванне для чарговага лета. Таму і вырашыла «Бярозка»: замест таго, каб сядзець у душнай рэдакцыі, лепш ужо з'ездзіць куды-небудзь ды распавесці пра гэта шаноўнаму чытачу. Напрыклад, павандраваць на пяты фестываль «Рок над Волгай» у Самарскай вобласці, што адбыўся сёлета ў чэрвені ў пяты раз.

Нашы незабывальныя кіроўцы

Ад Мінска да Самарскай вобласці — цэлых 1800 кіламетраў. Дарога наша на фестываль, аўтастопам, працягвалася два з паловай дні. Аўтастоп — гэта заўжды змястоўна. Гутаркі на самыя нечаканыя тэмы, спазнанне ўсё новых чалавекаў-сусветаў. Ты — выпадковы спадарожнік у чужой машыне — раптоўна з'явіўся ў жыцці кіроўцы і гэтак жа раптоўна знікнеш з яго назаўсёды, таму раскрыцца, зладзіць шчыры дыялог, падарожнічаючы стопам, — зусім няцяжка. Цэлы дзень у фуры з дальнабойшчыкам Дзмітрыем. Дзёрзкі, упэўнены ў сабе дзядзька, умее атрымліць асалоду ад жыцця. Аднак ежа і бясконцыя сексуальныя прыгоды — вось увесь сусвет гэтай асобы! Яшчэ адзін кіроўца, маскоўскі настаўнік Аляксандр, не такі, ён сапраўдны інтэлігент, любіць цішыню свайго лецішча і чытаць там кніжкі па гісторыі. Аляксандр выкладае геаграфію ў прыватнай маскоўскай школе, навучанне ў якой каштуе... 2000 долараў за месяц!

— Пашанцавала вам, — кажу, — у такой школе працаваць!

— Ну, як сказаць... Затое і выкладаць нам трэба сур'ёзна.

Чатырнаццаць чалавек у класе, падыход да кожнага, індывідуальны.

— А дзеці? Якія яны — з такіх забяспечаных сем'яў?

— Амбіцыйныя вельмі. Мы ўсё ж больш сціплымі былі... Кожны імкнецца быць індывідуальнасцю са сваім уласным меркаваннем. Тую смеласць, якую яны сабе дазваляюць, наўрад ці можа праявіць вучань у звычайнай школе. Апранаюцца так, каб вопратка абавязкова ад славутага брэнда. І гэты славуты брэнд — больш істотны, чым неспалучэнне колераў, напрыклад, альбо тое, што кофтачка да нагавіц не падыходзіць. І я таксама вымушаны добра апранацца, абноўкі мець рэгулярна, інакш заўважна горш будуць да мяне ставіцца.

— А якія прафесіі сярод гэтых загадкавых дзетак папулярныя?

— Вельмі стандартныя: юрысты, эканамісты розныя, банкаўская справа. Вельмі прывязаныя да статусу сям'і! Хлопчык, які любіць корпацца ў машынах, ніколі не дазволіць сабе гэтым займацца прафесійна...



Яшчэ нам запомніўся грузін армянскага паходжання. Грузіны і армяне — шляхетная, дарагая ўсходняя кроў! Працаваў гэты дзядзька-грузін у Расіі, але ж дзяцей сюды перавозіць не збіраўся: «У Грузіі больш спакойна! У нас там да дзяцей, згодна з апошнім заканадаўствам, трэба вельмі ўважліва ставіцца. А ў Расіі — наркотыкі ўжо ў школах, беспарадак...»

Былі і яшчэ незабывальныя кіроўцы: вельмі артадаксальны барадаты святар з цэлым фургонам свечак, і яшчэ адзін вельмі артадаксальны суб'ект — саентолаг, а потым сталая аматарка рок-музыкі і легендарнага Грушанскага фестывалю.

Падарожжа аўстастопам — бясконцая галерэя чалавечых сусветаў, гутаркі, гутаркі, гутаркі... Хтосьці жыве на Зямлі, каб вучыцца плесці капы з ветру, ну, а хтосьці нарадзіўся, каб спажываць, за асалодай ганяцца.

Канстанцін Кінчаў — навальніца!

Удзельнікі сёлетняга «Рока над Волгай» — гэта «Би-2», «Пикник», «Чиж и Со», «Аквариум»... Пяты фестываль сабраў 692 тысячы чалавек! У той час як у мінулым годзе фестывальны натоўп складаў 307 тысяч. Доўгая чарга машын, сапраўднае мора народу. Бліжэй да сцэны шчыльнасць такая, што паміж людзьмі яблыку, можа, і ёсць дзе ўпасці, але ж не больш, чым яблыку. Сцэна вышынёю ў дзевяціпавярховы дом! Даўжынёю — 60 метраў. Уся магчымая рокерская і панкаўская моладзь — вось хто збольшага наведвае фестываль.

Гурт «Алиса» стаў адным з хэдлайнераў. Легендарны рускі рок-гурт не састарыўся: якая магутная энергія, якая харызма! Назіраеш за пяцідзесяцічатырохгадовым Канстанцінам Кінчавым: ён — маг! Чараўнік! Рок-музыканта так шмат, ён як магутная божая навальніца! Трымаць велізарны натоўп сваім талентам, заварожваць яго — гэта настолькі моцна і незвычайна, што проста ў галаве не ўкладваецца. Такая яна, якасная рок-музыка ўжывую.

«Rammstein» на чале з вакалістам Цілем Ліндэманам у ружовым футры завяршалі фестываль ужо ў цемры. Музыканты са сваёй «мармуровай» выразнасцю нямецкай мовы таксама невытлумачальная плынь, неабдымнасць. Нават калі ты не аматар цяжкой музыкі, «Rammstein» ужывую ўсё адно цябе ўразяць, захопяць. «Сусветны ўзровень», — непазбежна зробіш выснову. Найшаноўныя еўрапейскія госці адыгралі паўнацэны канцэртны сэт, які ўваходзіць у іх падарожнае турнэ WirHaltenDasTempo — «Мы трымаем тэмп».

У розныя гады на фестывалі «Рок над Волгай» выступалі «Ленинград», «Океан Ельзи», «Король и Шут», Андрэй Макарэвіч, Пётр Мамонаў, «Алиса», «Сплин», «Агата Кристи», «ЧайФ», «Ночные снайперы». А таксама замежныя госці: Limp Bizkit і Garbage!

Насамрэч магутны рок-фестываль! Які пакідае пасля сябе агромністыя горы смецця...



Беларусь фестывальная

«Бярозка» склала спіс некаторых найбольш заўважных музычных фестываляў Беларусі, Расіі і Украіны, якія адбываліся сёлета і, спадзяёмся, працягнуць сваё існаванне. Не наведалі ў гэтым годзе? Запісвайце ў нататнічак і на наступнае лецейка плануйце!

«Пікнік.by», фестываль ладзіцца напрыканцы чэрвеня — у пачатку ліпеня. Арганізатары — клуб «Графіці» і агенцтва IBAD. Гэтае музычнае свята нарадзілася не так даўно: першы «Пікнік.by» адбыўся ў 2009 годзе. Імя фестывалю зрабілі такія беларускія гурты, як «Рэха», «Нагуаль», «Гаротніца», «Разбітае Сэрца Пацана», «Дай Дарогу», «ТТ-34», спявачка Паліна Рэспубліка і шмат хто яшчэ. Уваход — платны: гэтым летам складаў 180-200 тысяч рублёў. Сайт: picnic.by

«Вольнае паветра», ліпень альбо жнівень. Іграецца-адбываецца з 2006 года. Фестываль мае статус «міжнародны», бо за гэтыя гады тут паспелі выступіць не толькі такія беларускія гурты, як «Яр», «Троіца», AppleTea, «ДетиДетей», але і замежныя госці — немцы DiGrineKuzine, сербы Shazalakazoo. У 2007 годзе фестываль наведаў славуты рускі журналіст і музычны крытык Арцемій Троіцкі. «Вольнае паветра» спецыялізуецца на напрамку «worldmusic». Паўстаў фэст дзякуючы бровару «Сябар» і яго кіраўніку Сяргею Левіну. Непасрэдна арганізацыяй мерапрыемства займаюцца прадзюсары Аляксандар Багданаў і Яўген Калмыкаў. Уваход на фестываль платны.

«Басовішча» — самы алдовы ў Беларусі і самы легендарны рок-фестываль! Праводзіцца ў другой палове ліпеня Беларускім аб’яднаннем студэнтаў у Польшчы. «Фестываль Музыкі Маладой Беларусі» — вось як акрэсліваецца мерапрыемства. Адбываецца ажно з 1990 года. Праўда, на тэрыторыі Польшчы — на Беласточчыне, што зусім ля нашай Беларусі. Спіс выканаўцаў за ўсе гады — проста гісторыя беларускага року: «Уліс», «Мроя», «Новае неба», Zet, «Ляпіс Трубяцкой», Deviation, Gurzuf, Kriwi, палякі PidzamaPorno і шматлікія, шматлікія іншыя. Фестываль некамерцыйны, уваход вольны.

Кацярына БЕЗМАЦЕРНЫХ

Шукаючы — знойдзеш!*

Аповесць

За дзвярамі зазваніў званочак, і дзеці пачулі вясёлы голас Піцірыма Уладзіслававіча:

— Перапынак! Перапынак! Усім апранацца і крочыць на сняданак! Перапынак!

Косця пайшоў апранацца, а яго аднакласнікі нешта імкліва дапісвалі ў сшытках. Затым устаў з-за стала Антоній Костка, потым Хіхштэйн, а затым і дзед Сяргей. Косцік выйшаў з класа ўслед за ўсімі на вуліцу. Ён быў тут усяго раз і не паспеў разгледзець падрабязнасцей. Справа ў тым, што школа ў яго часе была сучасная — са сталоўкай і спартыўнай залай унутры. Дзе ж размяшчалася сталоўка тут, пакуль было невядома.

Неўзабаве ўсё стала зразумела. Вучні хутка выходзілі з будынка і, шумна размаўляючы, накіроўваліся за яго. Школа была васьмігадовая, так што класаў налічвалася столькі ж — прыкладна па трынаццаць—пятнаццаць вучняў у кожным.

За школай знаходзіўся такі ж аднапавярховы драўляны будынак, толькі з двума ўваходамі. Вучні ўпэўнена накіроўваліся ў далёкія дзверы. На ганку стаяў дырэктар і з усмешкай званіў у званочак.

— Хутчэй-хутчэй, а то ўсё ваўкі з'ядуць!

Вучні, асабліва са старэйшых класаў, калі праходзілі міма, усміхаліся дырэктару, а як толькі хаваліся з вачэй — смешна крывілі твары.

Перад залай сталоўкі быў вялікі калідор з вешалкамі. Вучні свабодна вешалі паліто і праходзілі далей. Абедзенная зала аказалася вельмі вялікім пакоем з расстаўленымі сталамі і лаўкамі. Кожны клас упэўнена накіроўваўся да свайго месца. Вось тут Косцю чакалі цяжкасці. Яго аднакласнікі спазняліся.

Нечакана з-за спіны пачуўся знаёмы голас:

— Шосты клас есць за тым крайнім сталом. Колькасць порцый заўсёды заказвае дырэктар, так што пачынай спакойна.

Косцік павярнуўся. За ім стаяў Андрэй Праўдаў. Ён скончыў школу два гады таму і цяпер дапамагаў у сталоўцы, дзе працавала яго маці.

— Дзякуй, — толькі і паспеў сказаць хлопчык, як збоку пачулася:

— Наш разумнік усюды першы! Усё рашыў і прыйшоў падсілкавацца!

Грышын голас, які не выгаворваў «р», можна было пазнаць і не паварочваючыся. Але Косця ўсё-ткі павярнуўся, памаўчаў, а потым сказаў:

---

* Працяг. Пачатак у № 2, 3, 4, 5, 6, 7 за 2013 г.

— А ты, я бачу, усё робіш апошнім, толькі есці прыходзіш хутчэй за ўсіх. Вядома, з такім ростам і плячамі есці хочацца. Дарэчы, колькі табе гадоў?

Адказу не пачуў, толькі той самы кулак, які так не спадабаўся Косцю, ужо ляцеў яму ў лоб і нішто, здавалася, не магло яго спыніць. Акрамя голасу дырэктара, канешне.

— А ну-ка, руку апусці ўздоўж цела. Ты ведаеш, Рыгор, я боек у сябе ў школе не пацярплю.

Страшны кулак бязвольна апусціўся, нібы з яго выпала костка. А Косці было прыкра, што за яго ўступіўся цукровагалосы Піцірым Уладзіслававіч. Лепш бы ён атрымаў у вока, чым абарона ад дырэктара.

У сталоўцы стаяла незвычайная цішыня. Дзеці пачалі ўжо есці, але спыніліся і моўчкі назіралі карціну: каля ўвахода стаіць здаравяк і злосна глядзіць на невялікага хлопца, а побач дырэктар і ўсім вядомы разумнік і спявак Андрэй Правадаў.

Косця вельмі ціха, не гледзячы на дырэктара, сказаў «дзякуй» і пайшоў да стала, на які за хвіліну да гэтага паказваў Андрэй Правадаў.

Пасля заняткаў у школе Косцік адправіўся дадому. Па дарозе яго дагнаў Сяргей.

— Ты так добра рашаеш матэматыку. У нас ніхто гэтак не можа.

Маўчаць было няветліва, але Косця не ведаў, што адказаць, таму проста пацiснуў плячамі.

— Выбачай, калі я табе штосьці дрэннае сказаў, мне проста падалося, што ты на Машу глядзеў.

«І правільна падалося», — падумаў Косця.

Толькі цяпер яму было не да каханай Сяргея. З галавы не выходзілі прыгожыя вочы Алены Правадавай. На ўсіх уроках яна паварочвалася і ўпотай пазірала на Кастуся. Калі ж сядзела спінай, то ён улюбёна разглядаў яе валасы.

— Нічога, я бачыў, што ты не са зла, — адказаў Косцік і ўсміхнуўся.

Усю дарогу яны ажыўлена абмяркоўвалі настаўнікаў і дырэктара. Сяргей распавядаў, адкуль яго бацькі і бабуля з дзядулем, а Косця слухаў, і ўсё тое, што адбываецца, перастала здавацца яму нерэальнасцю і чараўніцтвам. У яго з’явіўся блізкі сябар. Каб жа ў яго быў такі ў дзевяностых, ён абавязкова параіўся б з ім, ці лезці ў той дуб альбо не. Ён праводзіў Сяргея дадому, а сам накіраваўся па дарожцы да касцёла. Вельмі ўжо хацелася падзяліцца ўражаннямі з ксяндзом Паўлам. Косцік згадаў, што пакуль дзед быў жывы, то заўсёды любіў, каб унук сядзеў каля ягонага ложка. Распавядаў дзядуля пра вайну і пра партызан, гладзіў па галаве. Часам расказваў пра бабулю — якой яна была. І заўсёды казаў, што ніколі не адмаўляўся ад веры ў Бога, што яна яму заўсёды дапамагала. І памёр ён добра, калі так можна сказаць пра смерць. Перахрысціўся дрыжачай рукой, заплюшчыў вочы і больш не адкрываў. Як добра, што цяпер Косцік пазнаёміўся са сваім дзедам аднагодкам...

Касцёл быў зачынены, і Косцік вырашыў, што ксёндз дома. Ён пайшоў па дарожцы да дому, але потым, не заходзячы ў яго, вырашыў паглядзець на дуб. Ішоў ён з заміраннем сэрца. З аднаго боку хацелася, каб дуб рос на месцы, з другога — у яго тут з’явіліся два сябры, якіх ён назаўсёды страціць, як толькі

пройдзе скрозь адтуліну. А з трэцяга боку — там бацькі. І ўсіх шкада, і ўсіх хочацца любіць. І сябе шкада, таму што кімсьці ўсё роўна давядзецца ахвяраваць, а хочацца ж, каб і бацькі, і сябры знаходзіліся побач.

Дуба на месцы не аказалася. І Косцік нечакана для сябе з палёгкай уздыхнуў.

У доме ксяндза Паўла Косцік заўважыў, што нешта не так. Ці здарылася штосьці нядобрае? Заўсёды адчыненыя дзверы з кухні ў астатнія пакоі былі зачынены. За сталом, абапіраючыся на руку, драмала Косціна прабабуля. Калі хлопчык увайшоў, яна прачнулася, паглядзела на яго і сказала:

— Прыйшоў, унучак? А ў нас тут бяда. Зноў да ксяндза Паўла прыходзілі. Прымушаюць касцёл аддаць. Пагражаюць...

Косцік прысеў на лаўку, таму што ногі ў яго падкасіліся ад страху. Няўжо гэты страшны момант настане раней? Возьмуць і заб'юць яго, і нікога ўгаворваць не трэба... Косця прыслухаўся. З-за дзвярэй даносіліся галасы некалькіх мужчын.

Мінула некалькі доўгіх хвілін. Прабабуля зноў задрамала. Косця акуратна ўстаў, прыслухаўся. Усё яшчэ гавораць, але, здаецца, не крычаць, настойваюць. Толькі вось хто? Чакаць больш не было моцы. Косця ўзяў у рукі палатняны мяшэчак, з сілай, нібы ні пра што не ведае, штурхнуў дзверы. Калі яны расхінуліся, здзіўлена расшырыў вочы і прамовіў:

— Здрасце.

А сам тым часам разглядаў, што робіцца ў пакоі. За сталом сядзіць ксёндз Павел, твар, здаецца, спакойны. Спінай да дзвярэй — толькі зараз на хлопчыка азірнуліся — стаяць мужчыны ў чорных скураных плашчах, чорных штанах, зялёных кашулях і высокіх ботах. Жудасць нейкая. І твары такія злыя.

— Ідзі хлопчык, няма чаго тут табе рабіць, — выгукнуў адзін з мужчын. Косцік не зрушыўся з месца, паглядзеў на ксяндза і мацней сціснуў рукамі палатняны мяшэчак, гатовы ў любы момант ударыць каго-небудзь ім па галаве.

— Ідзі, Кастусь, паабедай пакуль, а мы тут вырашым свае пытанні.

Голас роўны, позірк спакойны, мяккі. Толькі твар белы. Можа быць, і праўда, няма пакуль ніякай вялікай небяспекі.

«Што ж, — вырашыў Косця, — павартую пад дзвярамі».

Выйшаў, зачыніў іх шчыльна, але сам прыклаў вуха, а раптам што-небудзь пачуе. І пачуў. Той жа голас, што загадаў Косцю выйсці, сказаў:

— Мы вас у апошні раз папярэджваем, вам тут рабіць няма чаго. Вашу царкву...

— Касцёл, — пачуў Косцік ціхі голас ксяндза.

— ...усё роўна забяруць. Лепш пакіньце яго нам самі.

— Не, — прамовіў ксёндз цвёрда. — Гэта Божы Дом, і я не дам вам яго апаганьваць, пакуль жыву на гэтым свеце.

— Мы вас папярэджвалі...

Ледзь-ледзь хлопчык паспеў адскочыць і сесці на лаўку, як дзверы расчыніліся і выйшлі мужчыны ў чорным. Ксёндз Павел не пайшоў іх праводзіць. Яны моўчкі прайшлі да выхада, і толькі апошні, той самы ўладальнік голасу,

павярнуўся і паглядзеў на Косціка. Доўга глядзеў. Але нічога не сказаў, выйшаў. Як толькі дзверы зачыніліся, прабабуля і Косцік зайшлі ў пакой. Ксёндз Павел так і сядзеў на тым жа месцы, перабіраючы ў руках ружанец, і глядзеў перад сабою. Такі ж бледны і маўклівы. Калі бабуля і хлопчык увайшлі, ён не адразу звярнуў на іх увагу. Толькі праз хвіліну зірнуў на хлопчыка, а потым і бабулю. Памаўчаў. Затым рэзка ўстаў і пайшоў да сябе ў пакой. Косцік пачуў, як у дзвярах пстрыкнуў замок.

4

Праз тыдзень Косціку ў школе стала вучыцца значна цікавей. Вядома, на яго па-ранейшаму нападалі то Грыша, то Валодзя Хіхштэйн, а то і Юзік Мельжыч. Але былі ў яго і сябры — дзед Сяргей ды Антоній Костка, Маша. Але самае прыемнае тое, што ў школе яго заўсёды чакала прыгажуня Алена.

І вось праз тыдзень Косцік ішоў са школы шчаслівым. Калі з раніцы яны вешалі вопратку на вешалкі, яна знарок стала побач з ім і дакранулася да яго сваёй рукой. Косціка як кіпенем апаліла. Ён пільна паглядзеў на Алену, але яна проста пайшла садзіцца. Косцік жа адчуваў, што не знарок яна вешала вопратку менавіта тады ж, калі і ён. І на другім уроку дачакаўся яшчэ аднаго сюрпрызу. У чарговы раз, разглядваючы Аленіну патыліцу, Косцік раптам убачыў, што дзяўчына падняла левую руку, а ў яе далоні люстэрка, у якім — накіраваны на яго погляд. Ён усміхнуўся ў адказ — рука апусцілася, люстэрка знікла.

Калі Косцік прыйшоў дадому, ксёндз Павел чакаў яго, седзячы за сталом у пакоі, як тады, калі прыходзілі тыя мужчыны. Прабабуля паспела шапнуць, што яны зноў наведваліся, і што ксёндз Павел хоча з ім пагаварыць.

Косцік зайшоў і зачыніў за сабой дзверы, хаця можна было і не хвалявацца — бабуля ўсё роўна не падслухоўвала.

— Сядзь, — прапанаваў ксёндз ціха, гледзячы ў падлогу.

Косцік прысеў. Радасную ўсмешку на твары змяніла здзіўленне.

— Яны зноў прыходзілі і прыгразілі, што калі я не аддам касцёл, пасадзяць у турму, абвінаваціўшы ў шпіянажы на карысць Польшчы. Як думаеш, што я ім сказаў?

— Не ведаю, напэўна, што не аддамо касцёл?

— Дакладна. — Ён, нарэшце, адарваў вочы ад падлогі і паглядзеў на Кастуся. Твар у святара быў белым, вусны шчыльна сціснутыя. — Я вырашыў, што вакол касцёла трэба выставіць ахову і пабудаваць плот.

— Каго? У сэнсе, хто пагодзіцца? — запытаў Косцік.

— Будзем начаваць у касцёле, па чарзе. І я таксама буду.

— Тады можна, калі вы пачнеце пільнаваць — і я з вамі, — папрасіў Косцік.

— Не, табе нельга, ты пойдзеш дадому.

Больш да гэтай гутаркі ніхто не вяртаўся. Ксёндз Павел практычна перастаў усміхацца, усё больш глядзеў у падлогу і думаў. А Косцік з таго дня кожны

раз, калі прыходзіў са школы, накіроўваўся да дуба і не знаходзіў там нічога. І зноў у ім змагалася некалькі пачуццяў, да якіх далучылася яшчэ і каханне.

Косцік ўсё хадзіў і хадзіў па полі, глядзеў на снег і разважаў. Кожны раз, калі ён заходзіць у клас, то шукае вачыма Алену. Калі яе няма — смуткуе і чакае. Калі дзяўчынка раптам спазняецца і прыходзіць пазней за ўсіх, ён адразу чырванее, не глядзіць на яе, змагаючыся з сабою. А вось учора, напрыклад, яна зноў вешала паліто разам з Косцікам, і зноў яе мяккая далонь слізганула па яго руцэ. І ён — о, жах — уздрыгнуў!

У пачатку снежня ксёндз Павел сапраўды дамовіўся з некалькімі моцнымі мужчынамі з Кавальчукоў. Яны па чарзе начавалі ў касцёле. Некалькі разоў за ноч рабілі абыход з ліхтаром і, што таіцца, са стрэльбай, пагрозліва цямнеючай за спінай. Але ніякай небяспекі пакуль не назіралася.

Праз месяц пасля цудоўнага з'яўлення Косціка у ранейшай вёсцы Кавальчукі, ён упершыню застаўся з Аленай сам-насам. Настаўніца пакінула іх прыбіраць клас, нібы адчуваючы, што патрэбны вырашальны паварот у іх адносінах. Алена старанна, аж пачырванела, падмятала падлогу, а Косцік вадзіў па дошцы мокрай анучай. Ён раз-пораз паўтараў ў галаве адну і тую ж фразу, нават варушыў вуснамі, але так і не наважыўся што-небудзь сказаць. Алена таксама маўчала, а час няўмольна ішоў. Вось ужо і падлога працёрта, і дошка чыстая. Можна ісці. Але яны ўсё знаходзяць прычыну застацца. І маўчаць. Нарэшце, Косцік зрабіў першы рашучы крок.

— Калі хочаш, я правяду цябе дадому, — прамовіў ён, гледзячы ў пад-логу.

— Хачу, — ледзь чутна адказала Лена.

Яны пачалі апранацца. Косцік узяў яе паліто, расхінуў і пачакаў, пакуль дзяўчынка прасуне рукі ў рукавы, а затым дапамог накінуць на плечы. Сам жа хутка апрануўся, закруціў шалік, і разам выйшлі з класа.

На вуліцы было вельмі холадна. Пасля цёплай школы ў твар пацягнула халодным ветрам, што ў дадзенай сітуацыі было дарэчы, таму што твары ў абаіх расчырванеліся. Косцік ўзяў Аленін мяшэчак і цяпер нёс два. І хлопчык, і дзяўчынка па-ранейшаму маўчалі. Вось ужо і з вёскі выйшлі, і шашу перайшлі, і ўсё моўчкі. І часу зусім мала застаецца да дома, а яны не размаўляюць. Так і дайшлі моўчкі да брамкі. Толькі Алена мяшэчак не забрала, а пайшла ў дом. Косця імгненне вагаўся, а потым рушыў следам. Чакаючы, што ў пярэднім пакоі гарыць святло, ён зачыніў дзверы, і тут натыкнуўся на Алену. Было цёмна. З маленькіх акенцаў прабівалася шэрае святло, але не даходзіла да дзяцей, рассейвалася. Косцік стаяў, трымаючы ў адной руцэ свой мяшэчак, а ў другой Аленін, і не мог нічога прамовіць. І зрабіць таксама. Што ў такіх сітуацыях робяць у кіно? Здаецца, абдымаюць дзяўчынку? Але Алена ўсё зрабіла сама. Яна стала блізка-блізка, пацалавала знямелага Косцю ў вусны, затым выхапіла свае рэчы, штурхнула дзверы, і хлопчык апынуўся на вуліцы.

Ганна СТАРЫКОВІЧ

Аповесць цалкам размешчана на сайце www.maladost.lim.by у рубрыцы «Поўная версія»

Дызайн лагатыпа на вокладцы *Веранікі ШНІП*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *Святланы СТАРАВЕРАВАЙ*
Стыльрэдактар *Кацярына ГОЛУБ*

Рэдакцыя не ўступае ў перапіску з чытачамі, не рэцэнзуе і не вяртае дасланыя рукапісы.
Пры перадруку спасылка на «Маладосць» абавязковая.

Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
Паштовы адрас: 220034, Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: 284-85-24, 284-41-88, 288-20-72.

Падпісана да друку 12.08.2013. Фармат 84×108 1/16. Папера газетная. Друк афсетны. Умоўн. друк. арк. 16,80.
Ул.-выд. арк. 14,76. Тыраж 2322 экз. Заказ 2544. Кошт нумара ў розніцу 16 600 руб.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009 г.

Часопіс «Маладосць» зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі РБ. Рэг. нум. 16.

maladost@bk.ru **http://maladosc.livejournal.com**

Заснавальнікі — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь;
грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»;
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»